## СТУПЕНІ ПАРАЎНАННЯ ПРЫМЕТНІКАЎ

Прыметнік мае тры ступені параўнання:
• звычайная (gradus positīvus);
• вышэйшая (gradus comparatīvus);
• найвышэйшая (gradus superlatīvus).
У звычайная ступені прыметнікі прыводзяцца ў слоўніку.

## GRADUS COMPARATIVUS

Утвараецца ад асновы звычайнай ступені. У *nom. sg.* дабаўляецца **-ior** (*m*, *f*), **-ius** (*n*), у *gen. sg.* **-iōr-is**. Аснова вышэйшай ступені супадае з формай *nom. sg. m*, *f*:

| | | | |
|---|---|---|---|
| ***Nom. sg.*** | **Аснова звычайнай ступені** | + | **-ior (*m*, *f*), -ius (*n*)** |
| ***Gen. sg.*** | | | **-iōr-is (*m*, *f*, *n*)** |

| Positīvus | Comparatīvus | | |
|---|---|---|---|
| | *Nom. sg.* | | *Gen. sg.* |
| | *m*, *f* | *n* | *m*, *f*, *n* |
| long-us, a, um<br>*доўгі* | long-**ior**<br>*больш доўгі, даўжэйшы* | long-**ius** | long-**iōr-is** |
| brev-is, e<br>*кароткі* | brev-**ior**<br>*больш кароткі, карацейшы* | brev-**ius** | brev-**iōr-is** |
| felix, felīc-is<br>*шчаслівы* | felic-**ior**<br>*больш шчаслівы, шчаслівейшы* | felic-**ius** | felic-**iōr-is** |
| sapiens, ent-is<br>*мудры* | sapient-**ior**<br>*больш мудры, мудрэйшы* | sapient-**ius** | sapient-**iōr-is** |

Вышэйшая ступень скланяецца па 3-м зычным скланенні.

**Узор скланення**

| Склон | Singulāris | | Plurālis | |
|---|---|---|---|---|
| | *m*, *f* | *n* | *m*, *f* | *n* |
| *Nom.* | long-ior | long-ius | long-iōr-**es** | long-iōr-**a** |
| *Gen.* | long-iōr-**is** | | long-iōr-**um** | |
| *Dat.* | long-iōr-**i** | | long-ior-**ĭbus** | |
| *Acc.* | long-iōr-**em** | long-ius | long-iōr-**es** | long-iōr-**a** |
| *Abl.* | long-iōr-**e** | | long-ior-**ĭbus** | |

## GRADUS SUPERLATIVUS

1. У большасці прыметнікаў утвараецца ад асновы звычайнай ступені з дапамогай суфікса -**issĭm**- і канчаткаў -**us**, -**a**, -**um**:

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Аснова звычайнай ступені** | + | **-issĭm-** | + | **-us, -a, -um** |

| Positīvus | Superlatīvus | | |
|---|---|---|---|
| | *m* | *f* | *n* |
| long-us, a, um<br>*доўгі* | long-**issĭm-us**<br>*самы доўгі, найдаўжэйшы* | long-**issĭm-a** | long-**issĭm-um** |

| Positīvus | Superlatīvus | | |
|---|---|---|---|
| | *m* | *f* | *n* |
| brev-is, e<br>*кароткі* | brev-**issĭm-us**<br>*самы кароткі, найкарацейшы* | brev-**issĭm-a** | brev-**issĭm-um** |
| felix, felīc-is<br>*шчаслівы* | felic-**issĭm-us**<br>*самы шчаслівы, найшчаслівейшы* | felic-**issĭm-a** | felic-**issĭm-um** |
| sapiens, ent-is<br>*мудры* | sapient-**issĭm-us**<br>*самы мудры, наймудрэйшы* | sapient-**issĭm-a** | sapient-**issĭm-um** |

2. У прыметнікаў на **-er** утвараецца ад формы *nom. sg. m* з дапамогай суфікса -**rĭm**- і канчаткаў -**us**, -**a**, -**um**:

***Nom. sg. m*** **+ -rĭm- + -us, -a, -um**

| Positīvus | Superlatīvus | | |
|---|---|---|---|
| | *m* | *f* | *n* |
| acer, cris, cre<br>*востры* | acer-**rĭm-us**<br>*самы востры, найвастрэйшы* | acer-**rĭm-a** | acer-**rĭm-um** |
| liber, ĕra, ĕrum<br>*свабодны* | liber-**rĭm-us**<br>*самы свабодны, найсвабаднейшы* | liber-**rĭm-a** | liber-**rĭm-um** |

3. У некалькіх прыметнікаў на **-ĭlis**, **e** утвараецца ад асновы звычайнай ступені з дапамогай суфікса -**lĭm**- і канчаткаў -**us**, -**a**, -**um**:

**Аснова звычайнай ступені + -lĭm- + -us, -a, -um**

| Positīvus | Superlatīvus | | |
|---|---|---|---|
| | *m* | *f* | *n* |
| facĭl-is, e<br>*лёгкі* | facil-**lĭm-us**<br>*самы лёгкі, найлягчэйшы* | facil-**lĭm-a** | facil-**lĭm-um** |
| diffcĭl-is, e<br>*цяжкі* | dificil-**lĭm-us**<br>*самы цяжкі, найцяжэйшы* | difficil-**lĭm-a** | difficil-**lĭm-um** |
| simĭl-is, e<br>*падобны* | simil-**lĭm-us**<br>*самы падобны* | simil-**lĭm-a** | simil-**lĭm-um** |
| dissimĭl-is, e<br>*непадобны* | dissimil-**lĭm-us**<br>*самы непадобны* | dissimil-**lĭm-a** | dissimil-**lĭm-um** |
| gracĭl-is, e<br>*вытанчаны* | gracil-**lĭm-us**<br>*самы вытанчаны* | gracil-**lĭm-a** | gracil-**lĭm-um** |
| humĭl-is, e<br>*нізкі* | humil-**lĭm-us**<br>*самы нізкі* | humil-**lĭm-a** | humil-**lĭm-um** |

Найвышэйшая ступень скланяецца 1—2-м скланенні.

### Няправільныя ступені параўнання

Пяць прыметнікаў утвараюць ступені параўнання ад розных асноў:

| Positīvus | Comparatīvus | | Superlatīvus |
|---|---|---|---|
| | *m, f* | *n* | |
| bonus, a, um — *добры* | melior | melius | optĭmus, a, um |
| malus, a, um — *дрэнны* | pejor | pejus | pessĭmus, a, um |
| magnus, a, um — *вялікі* | major | majus | maxĭmus, a, um |
| parvus, a, um — *малы* | minor | minus | minĭmus, a, um |
| multi, ae, a — *шматлікія* | plures | plura | plurĭmi, ae, a |

## Ужыванне ступеняў параўнання

1. Творны склон параўнання (ablatīvus comparatiōnis) ужываецца пры вышэйшай ступені. Абазначае аб’ект, з якім параўноўваюць. Перакладаецца з дапамогай прыназоўніка *за* + він. скл. або з дапамогай слова *чым*: Arbor altior **frutĭce** est. — *Дрэва вышэй* ***за куст*** (*вышэй*, ***чым куст***).



2. Родны склон выдзяляльны (genetīvus partitīvus) ужываецца пры найвышэйшай ступені. Абазначае цэлае, з якога выдзяляецца частка. Перакладаецца з дапамогай прыназоўніка *з* + р. скл.: altissĭma **arbŏrum** — *найвышэйшае* ***з дрэваў***.



3. Вышэйшая ступень можа абазначаць дастатковую выяўленасць якасці безадносна аб’екта параўнання (comparatīvus absolūtus — *незалежная вышэйшая ступень*). Перакладаецца з дапамогай слоў *даволі*, *дастаткова*: arbor **altior** — ***даволі высокае*** *дрэва*.



4. Найвышэйшая ступень можа абазначаць высокую выяўленасць якасці безадносна аб’екта параўнання (gradus elatīvus — *незалежная найвышэйшая ступень*). Перакладаецца з дапамогай слоў *вельмі*, *надта*: arbor **altissĭma** — ***вельмі высокае*** *дрэва*.



## Скланенне прыметнікаў (агляд)

Розныя ступені параўнання прыметнікаў скланяюцца па наступных скланеннях:

| Ступень | Скланенне | |
|---|---|---|
| Звычайная | 1—2-е скл. | 3-е галоснае скл. |
| Вышэйшая | 3-е зычнае скл. | |
| Найвышэйшая | 1—2-е скл. | |

## Прыслоўе
## (Adverbium)

Прыслоўі падзяляюцца на дзве групы: а) невытворныя (ubi — *дзе*, *калі*; ita — *так*, ut — *як*); б) вытворныя (утвораныя ад прыметнікаў, назоўнікаў, дзеясловаў).

1. Прыслоўі, вытворныя ад прыметнікаў, утвараюцца ад асновы прыметніка ў звычайнай ступені:

| Скланенне | Суфікс | Прыметнік | Прыслоўе |
|---|---|---|---|
| 1—2-е скл. | **-ē** | pulcher, chr-a, chr-um — *прыгожы* | pulchr-**ē** — *прыгожа* |
| 1—2-е скл. | **-o** | rar-us, a, um — *рэдкі* | rar-**o** — *рэдка* |
| 3-е скл. | **-ĭter** | facĭl-is, e — *лёгкі* | facil-**ĭter** — *лёгка* |
| 3-е скл. на -ns | **-er** | sapiens, ent-is — *мудры* | sapient-**er** — *мудра* |

2. У якасці прыслоўяў могуць ужывацца прыметнікі ў форме *nom./ acc. sg. n*: multus, a, um — *шматлікі* — multum — *шмат*; facĭlis, e — *лёгкі* — facĭle — *лёгка*.

3. Ад назоўнікаў, дзеясловаў і прыметнікаў прыслоўі ўтвараюцца з дапамогай суфікса -**tim** (-**im**):

| | |
|---|---|
| pars, part-is *f* — *частка* | part-**im** — *часткова* |
| sepăro, separā-re 1 — *аддзяляць* | separā-**tim** — *асобна* |
| privāt-us, a, um — *прыватны* | privāt-**im** — *у прыватным парадку* |

## Ступені параўнання прыслоўяў

Прыслоўі, утвораныя ад прыметнікаў, маюць ступені параўнання.

У якасці вышэйшай ступені прыслоўя ўжываецца форма *nom./ acc. sg. n* вышэйшай ступені зыходнага прыметніка:

| Прыметнік | | Прыслоўе | |
|---|---|---|---|
| Positīvus | Comparatīvus | Positīvus | Comparatīvus |
| facĭlis, e — *лёгкі* | facilior, facilius | facĭle — *лёгка* | facilius — *лягчэй* |

Найвышэйшая ступень прыслоўя ўтвараецца ад асновы найвышэйшай ступені зыходнага прыметніка з дапамогай суфікса -**e**:

| Прыметнік | | Прыслоўе | |
|---|---|---|---|
| Positīvus | Superlatīvus | Positīvus | Superlatīvus |
| facĭlis, e — *лёгкі* | facillĭmus, a, um | facĭle — *лёгка* | facillĭm**e** — *лягчэй за ўсё* |